ЯШЧЭ ТЫЯ ШТУЧКІ!

Салоны, якія некалі арганізоўвалі велікасвецкія дамы, адышлі ў мінулае, лічыце вы? Магчыма, што так. Але ў Гомелі такую традыцыю паспрабавалі адрадзіць. Здаецца, паспяхова. Дарэчы, на гэты раз умовай збору прадстаўніц прыгожага полу, якія ўваходзяць у абласную арганізацыю Беларускага саюза жанчын, былі наяўнасць доўгай сукенкі і высокіх абцасаў.

Падставай стала адкрыццё выстаўкі ў карціннай галерэі імя Гаўрыіла Вашчанкі. Экспазіцыя, між тым, адпавядае духу мерапрыемства. **Старшыня абласной арганізацыі Беларускага саюза жанчын Галіна ПАШЭД** гаворыць, што магчымасць «выгуляць» прыгожыя строі — не галоўнае для самадастатковых і ўпэўненых у сабе жанчын, за спінай у якіх вялікія калектывы і адпаведная адказнасць:

— У такіх нефармальных абставінах хутчэй завязваюцца кантакты і нараджаюцца новыя крэатыўныя ідэі. У нас атрымаўся не проста прыём актыўнай жаночай грамадскасці, а паўнавартасны імправізаваны баль.

Кіраўнік адміністрацыі СЭЗ «Гомель-Ратон» Антаніна ЯЖОВА.

Дрэс-код імкнуліся выканаць практычна ўсе госці. Яны вырваліся ў свет мастацтва з нарад і калегій, узялі тайм-аўт у дзяцей і мужоў. З цікавасцю і захапленнем пагрузіліся ў зусім іншую эпоху, прымералі вобразы дам мінулых стагоддзяў. Выстава «Ах, ужо гэтыя жаночыя штучкі...» прадставіла рарытэтны антыкварыят, які некалі знаходзіўся ў будуарах.

Парцалянавыя падсвечнікі, мудрагелістыя гадзіннікі, фігуркі вытанчаных танцорак і кранальныя чайныя цырымоніі ў мініяцюры, пастаральныя сцэны на карцінах і габеленах, размаляваныя талеркі, бронзавая скульптура... І побач — традыцыйныя жаночыя аксесуары: пальчаткі, флаконы для духоў, сумачкі для балю, наборы для шыцця і шмат чаго яшчэ. **Прыватны калекцыянер Сяргей ПУЦІЛІН** наўмысна сабраў «жаночую» экспазіцыю, якая нагадвае пра часіны, добра вядомыя па кніжках ці гістарычных фільмах:

— На працягу трох гадоў я набываў гэтыя рэчы, якімі карысталіся некалі жанчыны розных краін у XVIII—XX стагоддзях. Тут прадстаўлены, напрыклад, кабінет у стылі Дрэздэнскага барока і жаночы сакрэтнік эпохі Напалеона III. Ва ўсе часы жанчыны акалялі сябе кветкамі і марылі пра каханне.

Між тым арыгінальныя рамантычныя аксесуары займалі не толькі дам мінулых стагоддзяў. Сумачкі, прыгожыя галаўныя ўборы, вееры, статуэткі, выявы купідонаў абавязкова натхняць жанчын, якія здольныя сваімі рукамі ствараць цуд у XXI стагоддзі, лічыць **бізнес-лэдзі Лілія КАЛЮЖНАЯ,** якая ўтрымлівае краму, дзе майстрыхі з усёй Гомельшчыны размяшчаюць свае арыгінальныя хэнд-мэйд творы:

Старшыня Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага саюза жанчын Галіна ПАШЭД.

— Кожная жанчына — нечая муза, яна ўпрыгожвае дом, гадуе дзяцей... Сёння дамы паглядзяць, а потым перашыюць, прыдумаюць і створаць цікавыя сучасныя рэчы, якія можна будзе апрануць на наступнае мерапрыемства.

У іншай зале гомельскай галерэі імя Вашчанкі — паказ адзення ад сучасных мадэльераў горада над Сожам. На імправізаваным подыуме — дэманстрацыя новай вясенне-летняй калекцыі жаночага і дзіцячага адзення. Не абышлося таксама без розыгрышаў прызоў і музыкальных віншаванняў. Маляўнічыя фотазоны з россыпам кветак, гучанне саксафона і гітары і ўвогуле пяшчотны настрой пераконваюць, што мілыя і моцныя жанчыны сабраліся разам не дарма. Прыгожыя дамы — самі ўвасабленне вясны, якая прыйшла, хоць пакуль відавочна і не вельмі заўважная.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

НАШ НАЙЛЕПШЫ ЎЧАСТКОВЫ

Настасся МАСЛОЎСКАЯ — старшы ўчастковы міліцыі РАУС Лёзненскага раёна, адна з нямногіх жанчын у краіне на такой пасадзе. У апошні зімовы дзень, падчас нашай сустрэчы, яна якраз рыхтавалася прымераць капітанскія пагоны — напярэдадні Настассю павысілі ў званні. Яе кіраўнікі канстатавалі, што афіцэр выдатна спраўляецца са сваімі службовымі абавязкамі. Найлепшая сярод калег, якія працуюць у аддзеле на аналагічнай пасадзе.

Намеснік начальніка РАУС Лёзненскага раёна Васіль КУЛАКОЎ расказаў, што Настассю ведаюць усе без выключэння жыхары вёсак, дзе яна адказвае за парадак. 728 чалавек у 14 вёсках — гэта яе ўчастак. (Ёсць яшчэ чатыры, дзе, на жаль, больш няма жыхароў.)

А пазнаёміліся мы з Настассяй падчас падрыхтоўкі рэпартажу пра работу мабільных рэйдавых груп. Разам тады наведвалі праблемныя сем'і, тых, каму неабходна асобная ўвага з боку праваахоўных органаў, прадстаўнікоў улады, службы сацыяльнай абароны... Міліцыянер з кім трэба паводзіла сябе сур'ёзна і патрабавальна. А вось падчас нашай паездкі па вёсках у службовым аўто зачаравала шчырай усмешкай і інтэлектам.

На пытанне, чаму выбрала менавіта гэтую, лічы, мужчынскую прафесію, адказала, што прыцягнула стабільнасць.

Бацькі яе, дарэчы, не мелі ніякага дачынення да праваахоўных органаў. Родам Настасся з Магілёўшчыны, а 11-годку скончыла ў Віцебскім раёне, куды сям'я пераехала на пастаяннае месца жыхарства.

Дзяўчына мае дзве вышэйшыя адукацыі: эканамічную і юрыдычную.

Пасля няўдалага паступлення ў акадэмію МУС яна стала студэнткай віцебскай ВНУ, дзе вучылася на эканаміста. Потым служыла ва ўнутраных войсках у віцебскай дзіцячай калоніі і ўжо завочна вучылася ў міліцэйскай акадэміі. Пасля закрыцця калоніі, на базе якой ужо некалькі гадоў функцыянуе жаночы лячэбна-працоўны прафілакторый, перайшла на службу ў Лёзненскі РАУС.

— Адразу была інспектарам па справах непаўналетніх. Потым — старшым оперупаўнаважаным групы па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі. І ўжо некалькі гадоў — старшы ўчастковы інспектар міліцыі... Вельмі ўдзячная Андрэю Дашкову, таксама старшаму ўчастковаму інспектару, які мне шмат у чым дапамагае, — расказвае яна.

Тое, што Настасся дзяўчына, спрашчае яе кантакты з законапаслухмянымі людзьмі.

— Напэўна, у прысутнасці жанчыны нават яны стараюцца весці сабе дастойна. Канешне, усякае бывае, але нават залежныя ад алкаголю ці раней судзімыя не дазваляюць сабе зневажанняў у мой адрас, — расказвае міліцыянер.

Хоць рознае бывае. Напрыклад, на падворку, дзе жывуць выпівакі, ліхі сабака не дае прайсці, або ў доме святла няма. Ці мала што далей можа здарыцца? Але работа ёсць работа, ды і Настасся за столькі гадоў ужо прызвычаілася да розных нечаканасцяў.

Грамадзяне, асабліва ў паважным узросце, ставяцца да яе з душэўнай цеплынёй, як да дачкі.

Адна з тых, каму дапамагла капітан Маслоўская, — Валянціна Зуева. Яе муж злоўжываў спіртным, дома была напружаная абстаноўка. Міліцыянер зрабіла ўсё неабходнае, каб выправіць сітуацыю.

Цесна супрацоўнічае яна і са старэйшынамі, сваімі першымі памочнікамі, якія ведаюць усё пра ўсіх і адразу паведамляюць, калі чужыя з'яўляюцца ў населеным пункце. Дапамагаюць выяўляць нелегальных пакупнікоў металу, самагоншчыкаў, кантрабандыстаў — побач жа Расія.

У Яскаўшчынскім сельвыканкаме, куды мы завіталі, выказалі шмат прыемных слоў у адрас Настассі. Старшыня Тэрэса Шынкевіч і кіраўнік спраў Аксана Дрылёнак расказалі пра высокі прафесіяналізм старшага ўчастковага, адказнасць, уменне прыняць правільнае рашэнне ў праблемных сітуацыях.

— Працуем у цесным кантакце: перавыхоўваем нядбайных гаспадароў, разам абследуем праблемныя і шматдзетныя сем'і, адзінокіх, адзінока пражываючых, — удакладніла старшыня сельвыканкама.

Яна ўпэўнена, што і ў новым для сябе кірунку дзейнасці — Настассю Маслоўскую ўпершыню выбралі дэпутатам — яна сябе абавязкова праявіць.

А яшчэ Настасся здзівіла тым, што не карыстаецца электроннай поштай, і ў яе няма старонак у сацыяльных сетках. Любіць беларускую літаратуру. Прызналася, што раней нават пісала вершы на роднай мове.

Паводле слоў **афіцыйнага прадстаўніка УУС Віцебскага аблвыканкама Вольгі ШКУРАТАВАЙ,** на Віцебшчыне разам з Настассяй Маслоўскай працуюць чатыры жанчыны-ўчастковыя.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.